Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка”

# Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні

Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю БДПУ імя М. Танка

Мінск, 25 кастрычніка 2002 г.

Выпуск 2

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск
2002

– 187471 дзесяцін (58,1 %), кустоўе – 124443 дзесяціны (38,5 %). У сялян жа навогул не было таварнага лесу, а будаўнічы займаў толькі 30 дзесяцін [11].

Такім чынам, абязлесенне тэрыторыі Беларусі адбывалася за кошт скарачэння памешчыцкіх і казённых лясных масіваў. Пры гэтым памешчыкі звычайна прадавалі прамыслоўцам лес на пні (разам з зямлёй). Пасля высечкі зямля, як правіла, прадавалася мясцовым сялянам. У казённых лясных дачах продаж лесу быў заснаваны на больш рацыянальных пачатках. Так, Віцебскі губернскі статкамітэт адзначаў, што толькі ў адным маёнтку памешчыка Урбі ў Дрысенскім павеце лясная гаспадарка вяляся планава. “Памешчыкі глядзяць на лес як на крыніцу буйнога адначасовага даходу… Яны не эксплуатуюць лес гаспадарчым спосабам і перадаюць гэта права лесапрамыслоўцам. Апошнія тут, як і ўсюды, глядзяць на справу з вузкакупецкага ці гандлярскага пункту гледжання” [12, 176-177].

Нястрыманае знішчэнне лясоў выклікала трывогу ў царскага ўрада. 4 лютага 1888 г. быў выдадзены лесаахоўны закон, які на некаторы час упарадкаваў лесаводства. Ён прадугледжваў абмежаваную высечку лесу і арганізацыю навуковай лесагаспадаркі. Але павелічэнне крэдытнай запазычанасці памешчыцкіх маёнткаў, з аднаго боку, і кошт лесу, з другога, прывяло да таго, што на пачатку XX ст. высечка прыватнаўласніцкіх лясоў дасягнула такіх памераў, што Галоўнае ўпраўленне землеўладкавання і земляробства ў 1913 г. падрыхтавала праект закону аб паступовай скупцы казной прыватнаўласніцкай лясной зямлі. Ён быў унесены на разгляд IV Дзяржаўнай думы [13, 43].

Гандаль беларускім лесам ішоў у асноўным у паўднёвым і заходнім накірунках. Транспарціроўка лесу галоўным чынам адбывалася па рэках, а пазней і па чыгунках. Важнае значэнне мелі дняпроўска-прыпяцкі водны шлях для дастаўкі лесу на поўдзень імперыі і прыпяцка-заходнядзвінскі для экспарту лесу і лесаматэрыялаў у краіны Заходняй Еўропы, асабліва ў Германію. Да 90-х гг. XIX ст. лес з Беларусі вывозіўся ў асноўным неапрацаваным. Лесапільныя заводы ў памешчыкаў сустракаліся вельмі рэдка. Так, да пачатку 80-х гг. у Магілёўскай губ. былі толькі 2 дваранскія лесапільныя заводы (83 рабочых і гадавая сума вытворчасці на 51200 руб.). У Мінскай губ. да 1876 г. дзейнічаў толькі адзін такі завод з гадавым даходам 100 руб. [14, 173-174; 15, 126]. Прадпрымальніцкі бум у гэтай справе наглядаўся ў 90-х гадах у сувязі з прамысловым пад’ёмам. У гэты час на сучаснай тэрыторыі Беларусі было заснавана 25 памешчыцкіх заводаў па механічнай апрацоўцы дрэва. У 1903 г. на іх было задзейнічана 652 рабочых, гадавая сума вытворчасці склала 817,5 тыс. руб. На долю Мінскай і Магілёўскай губерняў прыпадала па 10 лесапільняў. Найбольш буйнымі сярод іх былі лесапільны завод двараніна Багуслаўскага Рэчыцкага павета (23 рабочых і 13240 руб. сума вытворчасці) і пробачны завод дваран Кеневіча і Ельскага ў г. Пінску (55 рабочых і 110200 руб. сума вытворчасці). [16, 183–184, 190, 205–207].

Асноўнымі скупшчыкамі лесу і лесаматэрыялаў у памешчыкаў былі мясцовыя лесапрамыслоўцы-яўрэі і германскія прадпрымальнікі. Толькі адзін раён Кенігсберга ў пачатку XX ст. атрымліваў лесу, які сплаўляўся па Нёману і Вісле, на суму 19 млн. руб. штогод. У сувязі з пашырэннем пераапрацоўкі лясных матэрыялаў у Заходнім краі, Германія павялічыла на іх увозныя тарыфы. У выніку толькі Прынёманскі раён Віцебскай губ., адкуль у пачатку XX ст. вывозілася праз Прусію ў Англію лясных матэрыялаў на 10–12 млн. руб., страчваў ад 1,5 да 4 млн. руб., якія асядалі ў руках нямецкіх пасрэдніцкіх фірм. Толькі напярэдадні Першай сусветнай вайны было створана манапалістычнае аб’яднанне мясцовых прамыслоўцаў “Саюз лесапрамыслоўцаў Паўночна-Заходняга краю”, адной з задач якога было супрацьдзеянне засіллю замежнага капіталу [1, 159].



Літаратура


1. Лиштейкий Л.П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии. Мн., 1971.
2. Статистический обзор Могилёвской губернии на 1914 год. Могилёв, 1915.
3. Леса БССР (сборник Института леса АН БССР). Мн., 1954.
4. Энциклопедический словарь. СПб., 1892. Т. 12.
5. Памятная книжка Витебской губернии на 1885 год. Витебск, 1885. Ч. 2.
6. Статистика Российской империи. XXII. Главнейшие данные поземельной статистики по обследованию 1887 года. Вып. XXII. Минская губерния. СПб., 1896.
7. Обзор Виленской губернии за 1895 год. Вильна, 1896.
8. Белоруссия в эпоху капитализма. Мн., 1983. Т. 1.
9. Таварны лес – гэта ў асноўным карабельны.
10. Ястремский Ф. Учет и оценка земель Минской губернии. Мн., 1900.
11. Обзор Гродненской губернии за 1913 год. Гродно, 1914. Приложение. Ведомость № 6.
12. Витебская губерния. Историко-географический и статистический обзор. Витебск, 1890. Вып. 1.
13. Вестник Минского губернского земства. Мн., 1914. № 1.
14. Опыт описания Могилёвской губернии. Могилев, 1884. Кн. 2.
15. Список землевладельцев Минской губернии за 1876 год. Мн., 1877.
16. Список фабрик и заводов Европейской России. СПб., 1903.


## РАЗВІЦЦЁ БУЛЬБАВОДСТВА Ў ПРЫВАТНАЎЛАСНІЦКІХ ГАСПАДАРКАХ БЕЛАРУСІ. 1861-1914 г.г.

**А.П. Жытко, Мінск**

У перыяд станаўлення і развіцця капіталістычных адносін важнае месца ў сельскагаспадарчай вытворчасці адводзілася вырошчванню бульбы на харчовыя, тэхнічныя і кармавыя мэты. Прычым наглядаўся працэс спецыялізацыі розных галін гандлёвага земляробства. Гэта стварыла перадумовы для ўтварэння буйных спецыялізаваных гандлёва-капіталістычных памешчыцкіх гаспадарак, якія арыентаваліся, у прыватнасці, на вырошчванне бульбы.

Вялікае значэнне ў парэформенны перыяд для развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі меў пераход да прамыслова-тэхнічнай культуры бульбы. Ён прывёў да змены не толькі ўсёй сістэмы земляробства, але і да значнага павелічэння перапрацоўкі мясцовай сыравіны па броварах і крухмальных заводах. З развіццём бульбяной гаспадаркі ўзмацняліся і гандлёвыя сувязі паміж горадам і вёскай.

Прыродна-кліматычныя і эканамічныя ўмовы Беларусі спрыялі шпаркаму распаўсюджванню бульбяной вытворчасці. Тут ужо на прыканцы XIX ст. сфарміраваўся раён малочна-мяснога накірунку з развітай вытворчасцю бульбы.

Аб капіталізацыі сельскай гаспадаркі сведчыць факт пашырэння пасяўной плошчы пад бульбу. Так, з 1861 да 1900 г. памер займаемай плошчы пад бульбай у Беларусі павялічыўся ў 2,5 разы [1, 111]. У прыватнаўласніцкіх гаспадарках пасяўны бульбяны клін павялічваўся як за кошт памяншэння паравога поля, так і ў выніку выцяснення збожжавых культур, аб чым сведчаць дадзеныя *Таблiцы 1*.



РЕПОЗИТОРИЙ ВГТУ